**Л.К.Валасюк,** *дацэнт*

# ДЗЕЙНАСЦЬ ПРАДМЕТНА-МЕТАДЫЧНАЙ КАМІСІІ ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ БУДУЧЫХ УДЗЕЛЬНІКАЎ АНСАМБЛЯЎ

Удасканаленне сістэмы адукацыі ў навучальных установах культуры патрабуе значнага паглыблення прафесійнага і эстэтычнага выхавання студэнтаў. Гэтай мэце служыць увесь комплекс дысцыплін. У працэсе навучання ў студэнтаў павінна скласціся дакладнае ўяўленне аб ідэйна-мастацкіх высновах музычнага мастацтва і задачах, якія патрэбна вырашаць, ажыццяўляючы музычную адукацыю. Важнейшым сродкам для дасягнення гэтай мэты з'яўляецца глыбокае вывучэнне спецыяльных прадметаў.

Кафедра народна-інструментальнай творчасці БДУ культуры і мастацтваў рыхтуе спецыялістаў розных напрамкаў: кіраўнік аркестра, кіраўнік ансамбля, выкладчык спецінструмента і інш. У 1991 г. з адкрыццём новай спецыялізацыі "кіраўнік ансамбля" кафедра пачала рыхтаваць інструменталістаў-удзельнікаў ансамбля. Вялікую ролю ў адкрыцці новай спецыялізацыі адыграла прадметна-метадычная камісія па спецінструменце (струнныя народныя інструменты) і інструментальным ансамблі. Былі складзены новыя вучэбныя планы, з улікам усіх неабходных прадметаў распрацавана мадэль будучага спецыяліста. Адной з асноўных дысцыплін у падрыхтоўцы спецыялістаў з'яўляецца інструментальны ансамбль. Былі распрацаваны праграма па гэтай дысцыпліне, а таксама новы курс "Методыка работы з ансамблем", які спалучае лекцыйныя і практычныя заняткі. З увядзеннем новай спецыялізацыі была вельмі патрэбная практычная дысцыпліна "Вывучэнне аркестравых інструментаў", якая дазваляла студэнту набываць практычныя навыкі ігры на розных народных інструментах. Некаторы час яна была прадугледжана вучэбным планам, але потым, на вялікі жаль,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

была выключана. Калі студэнт мае добрую практычную падрыхтоўку (валодае 3–4 інструментамі), то гэта дазваляе рабіць разнастайным склад ансамбля, больш якасна, прафесійна рыхтаваць будучых кіраўнікоў ансамбляў. Ім, а таксама і дырыжорам аркестра трэба набыць як мага больш ведаў і навыкаў, неабходных у практычнай рабоце. Вывучэнне дадатковага фальклорнага інструмента студэнтамі I і II курсаў часткова вырашае гэта пытанне. Навучэнцы знаёмяцца з 1–2 інструментамі (дудка, гармонік, мандаліна), але гэтыя інструменты выкарыстоўваюцца эпізадычна ў ансамблях.

Прадметна-метадычная камісія шмат увагі надае вытворчай практыцы студэнтаў, удзельнікаў ансамбляў, якая праходзіць на розных базах. Камісіяй распрацаваны адпаведныя патрабаванні і рэкамендацыі студэнтам.

Інструментальны ансамбль разам з іншымі спецыяльнымі дысцыплінамі (спецінструмент, методыка работы з ансамблем, фальклорны інструмент, інструментоўка, аранжыроўка і інш.) фарміруе ў навучэнцаў прафесійна-выканаўчыя якасці спецыяліста дадзенага профілю, выхоўвае свядомыя адносіны да творчай дзейнасці. У класе ансамбля студэнты рыхтуюцца да практычнай дзейнасці ў якасці кіраўнікоў рознага тыпу ансамбляў. Гэта патрабуе якаснай падрыхтоўкі студэнтаў па спецінструменце. На кафедры ідзе раздзяленне на спецыялізацыі "кіраўнік аркестра", "кіраўнік ансамбля" толькі пасля III курса. Гэта вельмі позна. Камісія неаднаразова выходзіла з прапановай аб раздзяленні на спецыялізацыі пасля II курса.

Ансамблевае выканаўства на народных інструментах вельмі распаўсюджана як у навучальных установах, так і ў аматарскіх калектывах. Саставы інструментальных ансамбляў вельмі розныя. Яны складаюцца як з аднародных інструментаў, так і змяшаных. Розныя яны і ў колькасных адносінах. Пры кафедры ў цяперашні час створаны разнастайныя вучэбныя ансамблі. Гэта патрабуе ад выкладчыкаў – кіраўнікоў калектываў – пастаянна ўдасканальваць сваё прафесійнае майстэрства і больш скрупулёзна

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рыхтаваць студэнтаў па абранай спецыяльнасці. Работа змяшаных саставаў павінна і далей удасканальвацца. Але для больш практычнай падрыхтоўкі кіраўніка ансамбля лічым неабходным вучыць студэнтаў іграць і ў малых формах ансамбляў (дуэтах, трыо). Ігра ў камерным ансамблі вельмі неабходна. Прадметна-метадычная камісія распрацавала патрабаванні для студэнтаў I–II курсаў, якія іграюць у камерных ансамблях. У канцы года будуць праведзены канцэрты камерных ансамбляў.

Ансамбль – гэта адна з найважнейшых формаў калектыўнага выканання, якая спрые фарміраванню прафесійных якасцей, пашырае музычныя веды студэнта, удасканальвае навыкі ансамблевага выканаўства, пашырае рэпертуарны багаж будучага кіраўніка калектыву. Асноўная асаблівасць ансамблевай ігры – адзінае разуменне выканаўцамі зместу твора, адзіная трактоўка яго ўсімі ўдзельнікамі ансамбля. Гэта калектыўная творчасць, дзе кожная партыя мае свае задачы, свае функцыі, і, толькі спалучаючы іх разам, мы пачуем поўнае гучанне партытуры.

У працэсе работы ў класе ансамбля неабходна вырашаць наступныя задачы.

1. Удасканальванне студэнтамі выканальніцкіх навыкаў на інструментах.

2. Засваенне навыкаў ансамблевага выканаўства.

3. Развіццё навыкаў чытання нот з ліста ва ўмовах ансамблевай ігры.

4. Фарміраванне рытмічнай узгодненасці ў працэсе выканання.

5. Вызначэнне неабходных дынамічных суадносін галасоў, авалоданне ўсімі спецыфічнымі асаблівасцямі дынамікі.

6. Засваенне ансамблевага рэпертуару.

7. Вывучэнне методыкі работы з ансамблем.

8. Засваенне навыкаў выкарыстання розных сродкаў выканання.

Практычнае засваенне тэхнічных магчымасцей інструментаў, іх аплікатурных асаблівасцей, тэмбравага гучання аказвае вялікую дапамогу студэнтам пры выкананні інструментовак як

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

для разнастайных ансамбляў, так і для аркестраў. Студэнты іграюць у ансамблі творы, якія яны інструментуюць пад кіраўніцтвам выкладчыка па інструментоўцы. Вучэбны ансамбль – гэта творчая лабараторыя, дзе студэнты вучацца практычным навыкам інструментоўкі. Павінна быць вельмі цесная сувязь выкладчыкаў па інструментоўцы з вучэбным ансамблем. Важны шлях для дасягнення эфектыўнасці і выніковасці вучэбнага працэсу можа быць наступны: выкладчык-кіраўнік ансамбля выкладае інструментоўку ў студэнтаў-удзельнікаў ансамбляў. Гэта дае магчымасць больш якасна працаваць з імі. У выніку студэнт рыхтуе да дзяржаўнага экзамену праграму па інструментальным ансамблі з твораў, якія інструментаваў для ансамбля. Такім чынам, кожны ўдзельнік ансамбля паказвае сябе ў якасці саліста-інструменталіста ў суправаджэнні ансамбля.

Вялікая роля выкладчыка і кіраўніка ансамбля ў падборы рэпертуару, вызначэнні складу ансамбля для выканання кожнага канкрэтнага твора. Падбор рэпертуару з'яўляецца адным з вырашальных фактараў у стымуляванні мастацкага і тэхнічнага росту ансамблевых выканаўцаў. Выкладчык павінен выкарыстоўваць усё багацце кампазітарскіх стыляў і жанраў, уключаць у вучэбны рэпертуар творы замежнай, у тым ліку рускай і беларускай класікі, а таксама лепшыя ўзоры народнай музыкі. Паслядоўнасць вывучэння твораў вызначаецца мастацкім і тэхнічным узроўнем падрыхтоўкі ўдзельнікаў ансамбля і перспектывамі іх творчага росту. Прадметна-метадычная камісія надае шмат увагі праблеме рэпертуару ва ўсіх вучэбных калектывах. Вельмі сур'ёзна абмяркоўваюцца выступленні з праграмамі на экзаменах, канцэртах, запрашаюцца выкладчыкі па інструментоўцы, спецінструменце, праводзіцца дэталёвы аналіз праграм і выканання з удзельнікамі ансамбля.

Прадметна-метадычная камісія пастаянна ўдасканальвае падрыхтоўку студэнтаў па спецыялізацыі "кіраўнік ансамбля". Шмат выпускнікоў паспяхова працуюць з творчымі калектывамі ў розных установах культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ